Алесь СМАЛЯНЧУК

# РАМАН СКІРМУНТ: ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСІ

Раман Скірмунт застаецца адной з найбольш складаных для зразуменьня асобаў беларускай гісторыі. Цікавасьць да яе будзе захоўвацца, пакуль будзе актуальнай гісторыя беларускай дзяржаўнасьці XX ст.

Беларуская савецкая гістарыяграфія, якая грунтавалася на клясавым падыходзе, характарызавала Р. Скірмунта як «ярага ворага беларускага народа». Больш увагі надала яму гістарыяграфія польская. Аднак і яе ацэнкі былі падобныя. Польскі гісторык Ю. Бардах сьцьвярджаў, што Р. Скірмунт, як і некаторыя іншыя палітыкі, імкнуўся кіраваць беларускім народам у інтарэсах польскіх землеўладальнікаў.

Сёньня нас не задавальняюць многія адказы гістарычнай навукі на складаныя пытаньні: што больш хвалявала Р. Скірмунта — лёс беларускай зямлі ці лёс уласнага маёнтка і маёнткаў суседзяў-памешчыкаў? Ці ня быў пяцігадовы беларускі пэрыяд дзейнасьці Р. Скірмунта (1917—1921 гг.) толькі эпізодам яго складанай палітычнай біяграфіі?

Каб зразумець палітычнага дзеяча, трэба зразумець матывы ягоных паводзінаў. Тут можа дапамагчы аналіз пачатку дзейнасьці Р. Скірмунта, які прыпаў на гады першай расейскай рэвалюцыі і быў зьвязаны з польскім рухам у Беларусі і Літве.

Напярэдадні рэвалюцыі Р. Скірмунт быў ужо добра вядомы ў краі сваёй гаспадарчай дзейнасьцяй. Ён узначальваў «Таварыства па распрацоўцы сельскагаспадарчых і эканамічных патрэбаў Палесься». Зь ягонай ініцыятывы былі створаныя некалькі гаспадарчых установаў у гэтым рэгіёне Беларусі. Скірмунт уваходзіў таксама ў Раду Менскага сельскагаспадарчага таварыства.

На сьветапогляд Рамана Скірмунта моцны ўплыў аказаў ягоны бацька Аляксандар, вядомы дзеяч польскага руху ў Беларусі і Літве пры канцы XIX ст. Менавіта ён разам з Э. Вайніловічам спрыяў ператварэньню Менскага таварыства з установы, якая павінна была падтрымліваць расейскіх памешчыкаў, у арганізацыю дзеля абароны інтарэсаў мясцовых землеўладальнікаў. У 1897 г. А. Скірмунт быў ініцыятарам звароту менскай шляхты да Мікалая II з просьбай аднавіць дваранскія сходы, забароненыя пасьля паўстаньня 1863—1864 гг. У часе выбарчай кампаніі ў I Думу ягоны

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

голас вызначыў вынік галасаваньня аб тактыцы польскіх дэпутатаў на губэрскі выбарчы сход у Менску. Дзякуючы пазыцыі А. Скірмунта ў Менскім таварыстве, якое фактычна зьяўлялася Польскім губэрскім выбарчым камітэтам, перамагла прапанова, каб кожная «нацыя» і кожная сацыяльная кляса насельніцтва губэрні мела сваё прадстаўніцтва ў Думе. А. Скірмунт быў прыхільнікам краёўцаў-кансэрватараў.

Краёўцы — гэта асноўная плынь польскага нацыянальнага руху ў Беларусі і Літве напярэдадні і ў пэрыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. У палітычнай і грамадзкай дзейнасьці яны выступалі з пазыцыяў краю і заяўлялі, што кіруюцца ягонымі нацыянальна-культурнымі, рэлігійнымі, гістарычнымі ды эканамічнымі асаблівасьцямі ды інтарэсамі. Сярод краёўцаў вылучаліся кансэрватыўны й лібэральны кірункі. Прычым выразна пераважаў першы. Сьвядомасьць краёўцаў у значнай меры вызначала формула: ліцьвін (альбо русін) паходжаньнем, паляк па нацыянальнасьці. Апошняе (паляк па нацыянальнасьці) датычыла толькі культурнай прыналежнасьці. Краёўцы спалучалі гістарычную сьведамасьць прыналежнасьці да шляхты ВКЛ з адчуваньнем прыналежнасьці да польскае культуры.

Погляды А. Скірмунта падзяляў і ягоны сын. У 1905 г. у невялікай брашуры «Głos przeszłości i potrzeba chwili», выдадзенай пад псэўданімам Romunt у Львове, Р. Скірмунт пісаў, маючы на ўвазе сябе і сваіх аднадумцаў: «Акрамя тых, хто ўсімі сіламі імкнецца, як да роднай матулі, да Каралеўства Польскага, і асобаў, якія робяць стаўку на Расею, сярод шляхты ёсьць група людзей, сэрцам і душой адданых сваёй Радзіме — Беларусі і Літве».

Увосень 1905 г. Р. Скірмунт намагаўся палітычна аб'яднаць шляхту беларуска-літоўскага паходжаньня. У газэце «Кур'ер літэўскі» зьмясьціў дасланы Р. Скірмунтам зварот «Краёвай партыі Літвы і Русі». Гэта была праграма палітычнае партыі. Распрацоўваючы яе, Р. Скірмунт зыходзіў зь перакананьня, што беларуска-літоўскі край мае ўласныя інтарэсы і павінен мець уласную партыю. Праграма прапаноўвала паступовае ўвядзеньне ўсіх палітычных свабодаў, роўнасьць грамадзянаў перад законам. Яна зьвязвала будучыню краю з развіцьцём самакіраваньня. Нацыянальна-культурная частка праграмы прадугледжвала роўнасьць усіх нацыянальнасьцяў, магчымасьць атрымаць адукацыю на роднай мове. Прычым пачатковая адукацыя мела стаць бясплатнай і агульнадаступнай. Што да аграрнага пытаньня, то праграма выказвалася за ўздым дабрабыту безьзямельных і малазямельных сялянаў шляхам дзяржаўнай дапамогі ў набыцьці зямлі. Пры гэтым падкрэсьлівалася недатыкальнасьць прыватнай уласнасьці. Р. Скірмунт у гэты час выступаў супраць аграрнай рэформы, якая б нават часткова закранала памешчыцкае землеўладаньне.

Р. Скірмунт тлумачыў, што назва «Краёвая партыя Літвы і Русі» адпавядае асноўнаму насельніцтву краю. У дадзеным выпадку тэрмін «Русь» ён ужываў у афіцыйна прынятым сэнсе. Афіцыйная ідэялёгія сьцьвярджала, што існуе адзіны рускі народ і тры яго плямені — вялікарусы, беларусы і маларосы. Гэта ня значыць, што Р. Скірмунт ня бачыў асаблівасьцяў беларускага этнасу. Вось як характарызаваў ягоныя пагляды напачатку 1906 г. «Кур'ер літэўскі»: «Р. Скірмунт лічыць дастаткова моцным беларускі народ і яго імкненьне да разьвіцьця нацыянальнай культуры. Аднак, жывучы сярод беларусаў і ўкраінцаў, ён лічыць іх адзіным народам і называе «рускімі». Р. Скірмунт, насуперак меркаваньню большасьці краёўцаў, не адносіў палякаў да асноўных нацыянальнасьцяў краю.

У студзені 1906 г. Р. Скірмунт паўтарыў свой зварот. Палажэньні праграмы былі амаль тыя ж, а вось назва зьмянілася — «Краёвая партыя Літвы і Белай Русі». Новая назва больш поўна адпавядала паглядам палітыка. Студзеньскі зварот дае ўсе падставы сьцьвярджаць, што інтарэсы краю Р. Скірмунт імкнуўся абараняць толькі шляхам легальнай палітычнай дзейнасьці, выкарыстоўваючы тыя магчымасьці, якія зьявіліся пасьля абвешчаньня Маніфэста 17 кастрычніка 1905 г. Сур'ёзную ўвагу Скірмунт надаў сацыяльным дачыненьням на вёсцы. Ён выказаў спадзеў на захаваньне добрых адносінаў паміж шляхтай і сялянствам. Р. Скірмунт па-ра-

нейшаму выступаў супраць нават частковага адчужэньня памешчыцкіх земляў. Аднак на адным з восеньскіх (1905 г.) паседжаньняў Менскага сельскагаспадарчага таварыства ён прапанаваў прымаць у таварыства сялянаў на льготных умовах. А напачатку сьнежня 1905 г. пры абмеркаваньні ў Таварыстве пытаньня аб увядзеньні паліцыйнай варты ў маёнтках катэгарычна выступіў супраць. Сябра Рады Менскага таварыства, ён прапанаваў шукаць шляхі згоды зь сялянамі. Тут яскрава праявіўся характэрны для значнай часткі краёўцаў патэрналізм у дачыненьні да «хлопаў». Ён грунтаваўся на адчуваньні кроўнай блізкасьці зь мясцовым людам.

Выбары думскіх дэпутатаў ад Менскай губ. прынесьлі посьпех курыі землеўладальнікаў, дзе пераважалі нашчадкі спалянізаваных памешчыкаў беларускага паходжаньня. Сярод выбраных быў і Р. Скірмунт. Па колькасьці галасоў ён саступіў толькі вядомаму кадэцкаму дзеячу, паляку А. Лядніцкаму.

У Думе Р. Скірмунт увайшоў у так званае «Тэрытарыяльнае кола», якое стварылі польскія дэпутаты ад Беларусі й Літвы. Яны актыўна ўключыліся ў працу Думы. Р. Скірмунт быў выбраны сябрам аграрнай камісіі. Працаваць у ёй дэпутату ад краю было няпроста. Пры абмеркаваньні аграрнага пытаньня тон у Думе задавалі прыхільнікі радыкальных аграрных рэформаў. І, відаць, пад уплывам думскага абмеркаваньня Р. Скірмунт адмовіўся ад ранейшай катэгарычнасьці. Напачатку траўня чытачы «Кур'ера літэўскага» атрымалі магчымасьць пазнаёміцца з пазыцыяй дэпутата па аграрным пытаньні. Адзначыўшы, што ў Думе шмат прыхільнікаў рабаўніцтва землеўладальнікаў, ён выказаў меркаваньне, што бальшыня дэпутатаў усё ж такі не дапусьціць перамогі тых, хто выступае за «рызыкоўныя экспэрымэнты на вёсцы». Р. Скірмунт шчыра заяўляў, што галоўнаю мэтаю «Тэрытарыяльнага кола» ёсьць абарона інтарэсаў землеўладальнікаў. Пры гэтым ён упершыню прызнаў неабходным пашыраць сялянскае землеўладаньне, у тым ліку і за кошт памешчыцкіх земляў. Гэта належала ўзгадняць з асабістым жаданьнем памешчыка. Але ў асобных выпадках Скірмунт пагаджаўся і на прымусовае адчужэньне часткі памешчыцкіх земляў за адпаведную ўзнагароду.

У сярэдзіне траўня Р. Скірмунт выступіў у Думе пры абмеркаваньні аграрнай праблемы. Ён зноў прызнаў неабходным «садзейнічаць паляпшэньню сялянскай гаспадаркі й павелічэньню плошчы сялянскага землеўладаньня», але толькі ня шляхам радыкальнай аграрнай рэформы. На ягоны пагляд, перадача сялянам часткі памешчыцкіх земляў ня вырашыць праблемы беднасьці. Затое яна дасьць падставы радыкалам патрабаваць адчужэньня прыватнай уласнасьці наагул. Р. Скірмунт прагназаваў эканамічны й культурны заняпад Беларусі й Літвы ў выпадку правядзеньня радыкальнай аграрнай рэформы. Ён моцна крытыкаваў праект «працоўнікаў», які прадугледжваў нацыяналізацыю значнае часткі зямлі. Дэпутат лічыў, што ў такім выпадку адзіным спадкаемцам землеўладальнікаў стане дзяржава, а гэта прывядзе да бескантрольнага панаваньня бюракратыі.

Выступ выклікаў незадавальненьне бальшыні дэпутатаў, але на Р. Скірмунта гэта не зрабіла моцнага ўражаньня. Ён меў уласную пазыцыю і адстойваў яе. Дарэчы, ягонаю пазыцыяй абураліся ня толькі кадэты і «працоўнікі», але і многія сябры «Тэрытарыяльнага кола», якія лічылі недапушчальным адчужаць нават частку памешчыцкіх земляў. А Р. Скірмунт пагаджаўся на такое адчужэньне дзеля камасацыі, урэгуляваньня сэрвітутаў і ліквідацыі цераспалосіцы.

20 чэрвеня 1906 г. зьявілася ўрадавая дэкларацыя, якая яшчэ раз паказала, што ўрад І. Гарамыкіна цалкам ігнараваў думскую дзейнасьць у аграрным пытаньні. У адказ бальшыня думскіх дэпутатаў вырашыла прыняць зварот да народу. Гэта было парушэньнем заканадаўства. Р. Скірмунт выступіў супраць звароту: «Ён можа парушыць той варты жалю прывід улады, які яшчэ існуе... Думу лепш пакінуць у спакоі. Яна не павінна быць зброяй у партыйнай барацьбе... Краіне не патрэбныя пустыя звароты і дэкларацыі».

У другой палове 1906 г. імя Р. Скірмунта, як і раней, фігуравала сярод кіраўнікоў польскага руху ў Беларусі й Літве. Аднак паступова вакол ягонай асобы ўзьнікла атмасфэра адчужэньня.

Першымі з крытыкай Р. Скірмунта выступілі прыхільнікі эндэцыі. Партыя нацыянальных дэмакратаў Р. Дмоўскага выступала з вылучна польскіх нацыянальных пазыцыяў і змагалася з уплывамі краёўцаў у Беларусі й Літве. Для эндэкаў Р. Скірмунт быў яскравым увасабленьнем краёвасьці.

У жніўні 1906 г. кіраўнік эндэцыі на старонках «Дзённіка кіуёскага» так характарызаваў Р. Скірмунта: «Р. Скірмунт перш-наперш не ўважае сябе за паляка. У гутарцы са мною ён заявіў, што ён беларус, які адно ўзгадаваны ў польскай культуры, што ён ня мае найменшай патрэбы залічаць сябе да народнасьці, зь якой яго зьвязвае толькі культура».

Эндэцкі публіцыст В. Дважачак таксама заяўляў пра поўны адыход Р. Скірмунта ад польскай нацыі. На ягоны пагляд, гэтаму спрыяла «тутэйшасьць» Р. Скірмунта, якой ён і не саромеўся. Р. Скірмунт, як і вядомая публіцыстка краёвага лягеру Канстанцыя Скірмунт, ледзь ня з гонарам называў сябе «тутэйшым». Гэтае слова ён успрымаў як сынонім краёвага патрыятызму.

Р. Скірмунт досыць рэзка адказаў на крытыку. Ен параўнаў эндэцыю зь «истинно русскими патриотами». І першыя, і другія, на ягоны пагляд, аднолькава ігнаравалі інтарэсы краю. Польскі шавінізм ён лічыў аднолькава пагібельным і для лёсу палякаў у Беларусі і Літве, і для лёсу ўсяго краю. На ягонае меркаваньне, якраз дзейнасьць эндэкаў была галоўнаю прычынаю адноснай няўдачы польскіх землеўладальнікаў на выбарах у II Думу.

Безумоўна, у эндэцкіх ацэнках дзейнасьці Р. Скірмунта было перабольшаньне. Ен па-ранейшаму заставаўся дзеячом польскага руху. І невыпадкова ў верасьні 1906 г. віленскі біскуп Э. Роп, адзін з кіраўнікоў краёўцаў-кансэрватараў, падчас візытацыі касьцёлаў Горадзенскай губ. парушыў сваю праграму і заехаў у маёнтак Скірмунтаў Парэчча Пінскага пав., каб пабачыцца з Р. Скірмунтам.

Аднак польская грамадзкасьць у Беларусі і Літве сапраўды ўсё больш насьцярожана глядзела на Р. Скірмунта. Гэтае адчужэньне і было галоўнаю прычынаю няўдачы палітыка на выбарах у II Думу.

У студзені 1907 г. у Пінску адбыўся павятовы выбарчы сход па курыі землеўладальнікаў. Кандыдатура Р. Скірмунта была забаляатаваная. Ен атрымаў толькі 39 галасоў з 154 магчымых, хаця ў галасаваньні ўдзельнічалі 64 прадстаўнікі польскага буйнога і дробнага землеўладаньня.

У траўні 1907 г. Р. Скірмунта чакала яшчэ адно расчараваньне. Ен вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду віцэ-старшыні Менскага сельскагаспадарчага таварыства і саступіў амаль зусім невядомаму ў краі памешчыку У. Крупскаму. Гэтая няўдача была красамоўнай. Менскае таварыства было апірышчам краёўцаў-кансэрватараў, і параза Р. Скірмунта сьведчыла, што і краёўцы пачалі глядзець на яго як на чужынца. Адзін з кіраўнікоў кансэрватыўнага кірунку краёвага руху дэпутат Дзяржаўнага савета І. Корвін-Мілеўскі называў яго «беларусам польскай культуры».

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы